# ПРА АЙКОНІМ *САСНОВЫ* НА МАЗЫРШЧЫНЕ

***Мальчукова І.У.*** *(УА МДПУ імя І.П. Шамякіна, г. Мазыр)*
***Навуковы кіраўнік –*** *В.В. Шур, д-р філал. навук, прафесар*

**Сасно’вы** *(Сасновы)* – пасёлак у Каменкаўскім сельскім Савеце за 10 км ад Мазыра. У ім 692 жыхары. Назва ўтворана ад апелятыва *сасновы* – “які мае адносіны да сасны, уласцівы ёй” [ТСБМ, V, с. 68]. Паселішча знаходзіцца каля самага лесу, у якім пераважае гэтае дрэва. Відаць, таму тапонім і атрымаў такую назву. У мінулым гэтая аснова, як адзначаюць даследчыкі, была вельмі рэдкай і нетыповай для палескай тапаніміі. У пісьмовых дакументах мінулых стагоддзяў яна зусім адсутнічае. Колькасць такіх назваў хутка ўзрасла ў выніку перайменаванняў (В. Жучкевіч). На Беларусі вядомы 2 паселішчы з такой назвай, у Расіі − 13. У розных рэгіёнах Беларусі сустракаюцца наступныя варыянты і спалучэнні гэтага айконіма: *Саснавец* (Петрыкаўскі раён)*, Сасноўка* (Гомельскі раён), *Сасновы Бор* (Светлагорскі раён). Гэты айконім не тыповы для Палесся, пра што падрабязна пісаў В. Шур. Назвы *Сасновы, Саснавец* ад слова *сасна*, што значыць – паселішча ў соснах, сярод соснаў. Тапонімаў, утвораных ад назваў дрэў, на Беларусі многа: *Бярозаўка, Бяроза, Асавец, Букі, Альховае, Дуброўкі, Хвойнікі, Ракітнае, Грабаў* і інш. Пры стварэнні назвы *Сасновы* на Мазыршчыне была не ўлічана геаграфія слоў *сасна* і *хвоя*, бо на Палессі, як ужо адзначалася, слова *сасна* амаль не ўжываецца, яго адпаведнікам у мове карэнных жыхароў з’яўляецца лексема *хвоя*, а лес, дзе растуць маладыя хвоі, завецца *хвойнік*. Таму калі ўжо і прыйшлося назву выбіраць, то трэба было абавязкова мець на ўвазе і гэту акалічнасць, а ў аснову айконіма браць звыклае, натуральнае для Мазыршчыны слова *хвоя*. У такім выпадку паселішча магло б набыць назву *Хвойны*, або *Хвойнае*, або *Хвойнякі*, або *Хвойнікі* і інш. У суседніх з Мазыршчынай раёнах ёсць такія назвы: *Хойнікі* – цэнтр Хойнікскага раёна (упершыню згадваецца ў 1512 годзе), *Хваенск* у Жыткавіцкім раёне, *Хвойня* ў Петрыкаўскім раёне. Толькі ў Мазырскім раёне выяўлена 4 айконімы, якія ўтвораны ад назваў дрэў: *Асавец, Бярозаўка, Сасновы, Ясянец*. На Гомельшчыне 8 паселішчаў паходзяць ад апелятыва *хвоя*: *Хвойная Паляна, Зялёная Хвоя, Хвойнік, Хвойня, Хойнікі, Хвойка, Хвойнае, Хваенск,* і 4 − ад апелятыва *сасна: Сасновы Бор, Сасноўка (Акцябрскі раён), Сасноўка (Гомельскі раён), Сасновы.*

Пасёлак узнік ў 1960-я гады як даніна павагі беларускім геолагам на месцы дыслакацыі дзвюх геалагічных арганізацый, якія займаліся пошукамі нафты на Палессі. Экспедыцыя абследавала тысячы квадратных кіламетраў тэрыторыі рэспублікі. Жыхары Сасновага з удзячнасцю ўспамінаюць першага начальніка экспедыцыі, заснавальніка пасёлка Р.М. Лізуна, адна з вуліц пасёлка названа яго іменем.

МГПУ им. И.П.Шамякина